территориях, получать опыт обращения с измерительной и дозиметрической аппаратурой.

Практические занятия проводятся в оборудованной аудитории, где имеются наглядные пособия, приборы, схемы, плакаты, технические средства обучения. Для студентов составлены методические разработки и ход их выполнения.

Студенты в начале учебного года получают примерную тематику вопросов всех разделов дисциплины для самостоятельного изучения. Лучшие работы представляются на семинарских занятиях.

Исследовательские работы студентов рекомендуются на научную студенческую конференцию. Остальные студенты защищают работы на зачете.

---

1. *Мархоцкий, Я. Л.* Валеология : учеб. пособие / Я. Л. Мархоцкий. – 2-е изд. – Минск : Выш. шк., 2010. – 286 с.

2. *Мархоцкий, Я. Л.* Основы защиты населения в чрезвычайных ситуациях : учеб. пособие / Я. Л. Мархоцкий. – 3-е изд. – Минск : Выш. шк., 2010. – 206 с.

3. *Мархоцкий, Я. Л.* Основы радиационной безопасности населения : учеб. пособие / Я. Л. Мархоцкий. – Минск : Выш. шк, 2011. – 224 с.

4. *Мархоцкий, Я. Л.* Профилактика ВИЧ-инфекции : учеб. пособие / Я. Л. Мархоцкий. – 3-е изд. – Минск : Выш. шк., 2003. – 128 с.

5. *Мархоцкий, Я. Л.* Радиационная и экологическая безопасность атомной энергетики / Я. Л. Мархоцкий. – Минск : Выш. шк, 2009. – 112 с.

6. *Мархоцкий, Я. Л.* Советы терапевта. Гигиена питания / Я. Л. Мархоцкий. – Минск : Выш. шк, 2011. – 239 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**А. І. Марэцкі,**
*прафесар кафедры філасофіі,*
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт*

## АБ КАНТРОЛІ ВЕДАЎ СТУДЭНТАЎ ФАКУЛЬТЭТА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ: ПРАБЛЕМА ЭФЕКТЫЎНАСЦІ І ЯКАСЦІ (на прыкладзе дысцыпліны «Філасофія»)

Сумяшчэнне працоўнай дзейнасці і вучобы студэнтамі-завочнікамі, асабліва ў сувязі са скарачэннем працягласці лабараторна-экзаменацыйных сесій, павелічэннем аб’ему неабходнай вучэбнай інфармацыі і лімітаванымі тэрмінамі навучання,

выклікае вялікія цяжкасці. У іх пераадоленні значнае месца займае правільная арганізацыя вучэбнага працэсу.

Сярод галоўных фактараў павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці трэба выдзеліць арганізацыю навуковага абгрунтавання самастойнай работы студэнтаў. Выкладанне на завочным факультэце з'яўляецца своеасаблівай сістэмай кіравання самастойнай вучэбнай дзейнасцю і ўключае шэраг структурных элементаў, сярод якіх важнае месца займае кантроль за якасцю ведаў.

У сувязі з вышэйназванай акалічнасцю паўстае шэраг пытанняў. Як забяспечыць сістэматычнасць кантролю вынікаў вучэбнай дзейнасці, якая адбываецца па-за межамі непасрэдных кантактаў студэнтаў і выкладчыкаў? Ці могуць дадзеныя кантакты абмяжоўвацца рамкамі правядзення лабараторна-экзаменацыйных сесій? Якія метады выкарыстоўваюць у сувязі з увядзеннем інтэграванага модуля па агульнаадукацыйных прадметах?

Канешне, калі адзіным сродкам кантролю ведаў выступае залік ці экзамен, то ні пра якую сістэму гаварыць нельга. Вучэбным планам па дысцыпліне «Філасофія» прадугледжана правядзенне семінарскіх заняткаў і выкананне кантрольнай работы. Можна казаць, што становішча тут паляпшаецца, але паляпшаецца нязначна. У той жа час яно значна паменшылася на першым курсе, дзе з увядзеннем інтэграванага модуля значна скарацілася колькасць гадзін і адсутнічае кантрольная работа.

Каб палепшыць сітуацыю, неабходна выкарыстоўваць розныя формы прамежкавага кантролю і праводзіць работу са студэнтамі па арганізацыі і самакантролі вынікаў вучэбнай дзейнасці. Вынік будзе станоўчым толькі пры адпаведнасці матывацыі ў студэнта і выкладчыка. Яна будзе моцнай, паколькі сістэматычны кантроль па любой дысцыпліне патрабуе ад выкладчыка часу, які не ўлічваецца ў вучэбнай нагрузцы, а ад студэнта – гатоўнасці да кантакту з выкладчыкам у межсесійны перыяд і самастойнай працы.

Паўстае пытанне аб выхадзе з той сітуацыі, у якой знаходзяцца і студэнт, і выкладчык. Тут патрэбна, каб кожны з іх сам разабраўся ў тым, як ім дзейнічаць далей. На нашу думку, пры распрацоўцы індывідуальнай стратэгіі трэба звярнуцца да скарбаў сусветнай філасофскай думкі.

Па сваёй сутнасці, кантроль і ацэнка ведаў прадстаўляюць сабой дыялагічны працэс. Падкрэслім, што найважнейшай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

умовай паспяховага дыялогу з'яўляецца раўнапраўе яго ўдзельнікаў. Выкладчык, які задае пытанне, ведае адказ на яго і параўноўвае з адказам студэнта. Таму тут важна стварыць такую атмасферу ў дыялогу са студэнтамі, дзе яны адчувалі б, што іх думкі, меркаванні з'яўляюцца цікавымі і для выкладчыка. Так, напрыклад, па тэме «Беларуская філасофія і грамадска-палітычная думка» пры выкананні кантрольнай работы ці правядзенні заняткаў на падставе прыведзеных тэкстаў з першакрыніц патрабуецца аргументаваны адказ на пытанне «Рашаючую ролю пры перакладзе Бібліі Ф. Скарынам на родную мову адыграла:

А) ідэя Бога;

Б) ідэя Евангелля;

В) ідэя асветы народа;

Г) усе ідэі, пералічаныя вышэй.

У дыялогу выкладчыка са студэнтамі ствараецца атмасфера, у якой думкі, меркаванні, падыходы, аргументы цікавыя абодвум. Вельмі важна, каб такая атмасфера была пастаяннай і на аўдыторных занятках, і ў самастойнай рабоце, і на экзаменах. У такім выпадку навучанне будзе цікавым і для студэнтаў, і для выкладчыкаў, не згубіць сваёй дыдактычная задача.

Філасофія раскрывае магчымасці для арганізацыі паміж студэнтамі і выкладчыкамі змястоўнага дыялогу. Тут выяўляецца разнастайнасць асэнсавання чалавекам сусвету і яго месца ў ім, стаўленне студэнта да зместу і інтэрпрэтацыі зместу разглядаемага матэрыялу. Трэба падкрэсліць, што ў такіх выпадках выконваецца такая функцыя форм кантролю, як стымуляцыя далейшага пошуку, далейшай самастойнай работы. Адзначым у сувязі з гэтым ролю творчага пытання, якое мае вялікае значэнне ў навучальным працэсе ў цэлым і ў кантролі ведаў і навыкаў у прыватнасці. Яно патрабуе ад студэнта глыбокага аналізу разглядаемай праблемы, мабілізацыі яго ведаў. Тут выяўляюцца і ацэньваюцца веды студэнта і ствараюцца стымулы іх развіцця.

У філасофіі можна знайсці мноства цікавых, праблемных пытанняў і выкарыстаць іх для павышэння кантролю ведаў. Ужо пры першым знаёмстве з прадметам выкладчык робіць акцэнт на пытаннях, якія не могуць не вызваць у студэнтаў мабілізацыі інтэлектуальнага і духоўнага рэсурсу. Напрыклад, як нам зразумець свет, у якім мы жывем? У якіх суадносінах у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ім знаходзяцца матэрыяльнае і духоўнае? Як функцыянуе універсум? Адкуль усё паходзіць? У чым сутнасць рэчаіснасці? Ці патрэбны ўніверсуму стваральнік? Што такое чалавечая асоба, яе месца і роля ў грамадскім жыцці, гісторыі? У чым сэнс чалавечага жыцця?

Дыялагічная стратэгія выкладчыка ў кантраляванні і праверцы ведаў павінна ўлічваць спецыфіку адпаведнай спецыяльнасці. Пры разглядзе тэмы «Дыялектыка і яе альтэрнатывы» са студэнтамі мастацкіх спецыяльнасцей актыўны дыялог разгортваецца, калі прыводзяцца прыклады з іх прафесій. Так, студэнтам музычных спецыяльнасцей прапаноўваецца наступны тэкст: «Напомню рассказ эстета Рохлитца, друга Гете, о прощании Моцарта с семейством кантора Долеса в Лейпциге. В момент прощания с ним Моцарт написал два канона: один элегический – “Будьте здоровы, мы увидимся вновь”, другой комический – “Ревите еще, как старая баба”; каждый из них звучал прекрасно, а когда эти два канона спели вместе, то получилось не простое контрапунктическое сочетание разных тем, но полное органическое единство слившихся противоположностей, до того странное, особенное, глубокое, потрясающее, что все были страшно поражены, и сам Моцарт быстро закричал: “Прощайте, друзья!” – и убежал. Дело не в техническом кунштюке сочетания разных тем, а в органическом слиянии контраста в едином целом, внутренне противоречивом... Мы спускаемся на такую глубину мировых сил, где единство противоположностей реально. И Рохлитц кончает свой рассказ указанием, что соединить разные темы может всякий хороший контрапунктист, но в данном случае получилось единое целое, полное слияние различий, и в этом одна из глубочайших особенностей Моцарта» [3, с. 248]. Другі прыклад. «Ці можна згадзіцца са словамі вядомай песні: “Речка движется и не движется”, “Песня слышится и не слышится”?»

Дзейнасць выкладчыка на завочным аддзяленні ўмоўна можна падзяліць на тры часткі:

– падрыхтоўчая (падрыхтоўка да вучэбных заняткаў і планаванне самастойнай работы студэнтаў);

– непасрэдная работа са студэнтамі ў перыяд правядзення лабараторна-экзаменацыйных сесій;

– апасродкаванае кіраванне самастойнай работай студэнтаў у перыяд між сесіямі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Пры ўсёй значнасці кожнай з гэтых частак трэба выдзеліць асаблівую ролю першай, калі закладваюцца асновы кіравання самастойнай вучэбнай работай студэнтаў. Менавіта на гэтым этапе можна прапанаваць ахвотным выканаць шэраг творчых заданняў, а таксама далучыць да іх іншых студэнтаў. Гэта з'яўляецца адначасова і карыснай формай кантролю для выкладчыкаў.

Рамкі дадзенага артыкула не дазваляюць засяродзіць увагу на выкарыстанні іншых форм і метадаў кантролю ведаў і ўменняў студэнтаў факультэта завочнага навучання, але падводзячы рысу, падкрэслім яшчэ раз ролю творчых, праблемных пытанняў і заданняў і зацікаўленасць у іх рашэнні студэнтаў і выкладчыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


1. *Бабко, А. І.* Кантроль ведаў і ўменняў студэнтаў-завочнікаў: праблема эфектыўнасці і якасці (на прыкладзе выкладання «Асноў сучаснага прыродазнаўства») / А. І. Бабко // Удасканаленне дзейнасці кафедраў па прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў на факультэце завочнага навучання : матэрыялы навук.-метад. канф. (2 лют. 2012 г.). – Мінск : БДУКМ, 2012.

2. *Бабко, Г. И.* Управляемая самостоятельная работа студентов: теория и практика / Г. И. Бабко // Организация самостоятельной работы студентов на факультете вуза : материалы междунар. научн.-практ. конф., Минск, 16–17 нояб. 2006 г. – Минск : БГУ, 2006. – С. 7–8.

3. *Зарницкий, С.* Чичерин / С. В. Зарницкий, А. Н. Сергеев. – М. : Молодая гвардия, 1966. – 256 с.



**Г. В. Махнач,** *доцент кафедры информационных технологий в культуре, кандидат технических наук, доцент;*

**С. А. Гончарова,** *доцент кафедры информационных технологий в культуре, кандидат технических наук*


## УЧЕБНАЯ СРЕДА КАФЕДРЫ ИНФОРМАЦИОННЫХ ТЕХНОЛОГИЙ В КУЛЬТУРЕ: СИСТЕМНЫЙ ПОДХОД

Образовательная среда как часть социокультурной среды представляет совокупность социальных, культурных и специально организованных в образовательном учреждении психолого-педагогических условий, в результате взаимодействия которых